# Фотавыстаўка «Нябачныя героі»: паглядзець на людзей з асаблівасцямі ў іншым свеце

25.01.2024 09:45 | Аўтар: Лізавета Голад | Без рубрыкі

**Нестандартная фотавыстаўка «Нябачныя героі» адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Героі мастацкіх фотаздымкаў не звычайныя мадэлі, а падапечныя «Беларускага дзіцячага хоспіса», якія паўстаюць у вобразах беларускіх міфічных персанажаў, героеў беларускіх казак.**

> — Ідэя такога фотапраекта ў нас узнікла даволі даўно. Мы вырашылі скамбінаваць любоў да славянскай міфалогіі і любоў да нашых падапечных. — расказвае спецыяліст па сувязях з грамадскасцю грамадскай дабрачыннай арганізацыі «Беларускі дзіцячы хоспіс» Уляна Казакевіч, — Гэта было няпроста. Не ва ўсіх дзяцей гэта атрымлівалася чыста фізічна. У выніку ў нас атрымалася сабраць 9 удзельнікаў, для якіх мы падабралі розныя міфалагічныя вобразы.




**Таксама яна раскрыла філасофію назвы фотавыстаўкі:**




> — Вельмі часта інваліды ідуць крыху паралельна са здаровымі людзьмі. Усе імкнуцца быццам бы не заўважаць іх. Адсюль і назва «Нябачныя героі».




Фотаздымкі ўражваюць сваёй таямнічасцю, хочацца затрымацца даўжэй і разглядаць дэталі на кожным з іх. Аўтар гэтых твораў — студэнтка Ксенія Ляговіч. Дзякуючы ёй і Ульяне Казакевіч атрымалася такая цудоўная выстава, якая дазваляе ўбачыць людзей з асаблівасцямі ў зусім іншым свеце.




Усяго на выставе прадстаўлена 45 фотаздымкаў. Каля кожнай з 9 серый ёсць невялікае тлумачэнні па міфалагічнаму персанажу.
Выставу можна наведаць да 26 лютага. Яна размешчана ў галерэі «Панарама» на 22 паверсе.
















**Лізавета ГОЛАД**

**Фота аўтара**

Навіны | Папулярнае
11:24 Мінэканомікі: Беларусь зацікаўлена ў рэалізацыі доўгатэрміновых інвестпраектаў з «Расатамам»
11:03 Расіяне змогуць прагаласаваць на маючых адбыцца выбарах Прэзідэнта Расіі ў Мінску і ва ўсіх абласных цэнтрах
10:45 Беларусь павысіла тарыфы на пракачку нафты па тэрыторыі краіны
10:20 Францыя адхіліла запыт
УСЕ НАВІНЫ
Іншыя матэрыялы аўтара
Чым захапляецца пераможца конкурсу «Маладзёжны ПРАрыў Міншчыны 20/24»
Як адбылася прэзентацыя другой выставы цыкла
Як прайшло каляднае моднае шоу ў Нацыянальнай школе прыгажосці
Што рыхтуе нам трэці сезон конкурсу маладзёжных ініцыятыў
Хрышчэнскія купанні на стадыёне «Дынама»